View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Т.У.Ганчарова-Цынкевіч** (Беларусь,Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка )

# АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЦЁТКІ

Сярод беларускіх пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя імя Цёткі (Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч) займае адно з цэнтральных месцаў. Разам з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Багдановічам, Змітраком Бядулем, Карусём Каганцом і іншымі мастакамі слова Цётка ўзначаліла рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак у беларускай літаратуры, сваімі творамі садзейнічала станаўленню нацыянальнай класікі, а яе жыццёвы і творчы шлях стаў сімвалам усяго адраджэнскага руху таго часу.

Паэтка верыла, што народ – творца гісторыі і што будучае – у яго руках, таму імкнулася далучыць беларускі народ да культуры, якой дасягнула чалавечае грамадства.

У 1906 годзе Цётка загаварыла аб небходнасці адкрыцця народных школ у якіх бы дзеці вучыліся на роднай мове, і гэта дазволіла бы хутчэй асвоіць не толькі адукацыю, але і культуру іншых народаў. У артыкуле “Як нам вучыцца” пісала : “…Калі пачнуць у нас уводзіць новыя начальныя школы, трэба, канечне, каб дзяцей у іх навучалі па-беларуску, каб тлумачылі ім усё па-тутэйшаму, па-свойму, як дзецігавораць з бацькамі і як найлягчэй разумеюць.Тады дзеці і чытаць скарэй навучацца, і пазнаюцьлягчэй іншыя мовы – расейску ды польску. Дзеля таго ўсе буларусы і ўсе, хто хоча даць народу праўдзівую навуку, павінны дамагацца для беларусаў начальнай школы” [2, с.174].

У гэтым артыкуле асветніца выступіла і ў абарону нацыянальнай мовы : “Доўга мы беларусы, цураліся сваёй мовы і, як кажуць, хаваліся з ёю за печ перад чужымі людзьмі. Вось і злажылася нейкая дурная пагаворка, што наша мова хамска, брыдка, што на ёй не можна гаварыць з вучоным чалавекам, ані пісаць кніжак, як на іншых “далікатных” мовах. Але гэта толькі выдумка.”[2, с.174].

Выступаючы за неабходнасць адукацыі на роднай мове, Цётка пачала працу над складаннем кніжак для дзяцей. На пачатку XX стагоддзя яна была першай у гэтай справе сярод беларускіх пісьменнікаў.

Пад псеўданімам Тымчасовы ў 1906 годдзе пісьменніца выдалакніжку на беларускай мове лацінскімі літарамі “Гасцініц для малых дзяцей”.Тут былі змешчаны сем невялікіх апавяданняў у перакладзе з украінскай мовы і некалькі прыказак, прымавак, загадак.

Змест гэтых апавяданняў даваў магчымасць прывіць дзецям пачуццё любові да чалавека працы, навучыць дзяцей па-сапраўднаму шанаваць сяброўства (“Рыжая”, Неспадзяваны гасцінец”). У другіх апавяданнях

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэтай кніжачкі расказвалася аб птушках, раслінах, з’явах прыроды (“Расінка на рожы”, “Лебедзь”).

У тым жа 1906годзе ў Пецербурзе выдавецкая суполка “Загляне сонца і ў наша ваконца” выдала “Беларускі лемантар, або Першую навуку чытання”(без указання аўтарства Цёткі), а затым “Першае чытанне для дзетак беларусаў” (аўтарства Цёткі ўжо было засведчана).

“Беларускі лемантар…”быў адрасаваны настаўнікам. У ім даваліся парады, як трэба вучыць чытаць дзяцей, ён арыентаваў настаўнікаў і вучняў на адпаведныя правілы правапісання, а таксама тут былі змешчаны і тэксты для чытання.

“Першае чытанне для дзетак беларусаў” нагадвала падручнік-хрэстаматыю, куды уключаліся вершы, загадкі, апавяданні, нарысы, казкі, прыпеўкі, прыказкі. Гэты падручнік выдаваўся двойчы : лацінкаю і кірыліцай. Частка матэрыялаў, уключанных у гэту кніжачку – аўтарскія , напісаныя для “Першага чытання”, а частка – апрацоўка народнай творчасці пісьменніцай і адаптацыя фальклору да дзіцячага ўзросту.Усе творы чытанкі разлічаны на тое, каб выхаваць у падрастаючага пакалення любоў да сваёй радзімы, да роднай прыроды і акаляючага свету.

Так, напрыклад, вершы “Сынок маленькі”, “Мой сад”, “Лес”, “Родная вёска”, змешчаные Цёткай у гэтай кніжачцы, уражваюць глыбокім лірызмам, пачуццём цеплыні і шчырасці. Для ўзору прывядзём радкі з твора “Мой сад”:

*Стаіць мой сад пад белым цветам:*
*Нарцыс, стыдлівых поўны крас,*
*Звісае бэз ў акно букетам,*
*Тульпанаў куст расцвеў зараз.*
*…Люблю мой сад, як расцвітае,*
*Як салавей свой трэль вядзе,*
*Як цвет галінку прыгібае,*
*Як пчолка мёд адтуль нясе.* [2, с.154]

Захапленне роднай прыродай у вершы перарастае ў пачуццё вялікай любові да радзімы. Вершаваная прастора твора поўніцца адчуваннем квітнення і буяння жыцця. У ім чуецца сапраўдная песенная рапсодыя навакольнага свету. Паэтка захоплена цудам прыроы, у якой пануе суладнасць фарбаў і красак, працякаючых працэсаў і перыядаў.

Верш “Лес” напісаны ў форме звароту да лесу. Тут ён паўстае як жывая істота. Такімі рысамі паэтка надзяляе кожнае дрэва і тым самым стварае адпаведны казачны настрой, фарміруючы ў дзяцей вобразнае мысленне.

Беларускія краявіды ў вершах Цёткі выступаюць ва ўсёй сваёй прыгажосці. Аўтар з захапленнем малявала неабсяжныя прасторы, высокія хвоі і стромкія бярозы, велічныя лясы і шумлівыя рэкі, поўныя чароўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

хараства. З народных казак, апрацаваных пісьменніцай і ўключаных у “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, мы знаходзім такія як “Журавель і Чапля”, “Курыца і пятух”, “З прыску ды ў агонь”, “Пакуль не ў руках, не кажы, што тваё”, “Сварба”.

Ва ўсіх гэтых казках закранаюцца маральна - этычныя праблемы, якія могуць зацікавіць маленькага чалавека. На думку пісьменініцы, такія творы павінны былі садзейнічаць выхаванню будучых грамадзян беларускага краю, фарміраваць адпаведныя этычныя і эстэтычныя нормы паводзін.

Акрамя таго, Цётка ставіла задачу навучыць дзяцей правільна чытаць і вымаўляць, таму над кожным словам тэкста ставіла націскі. Гэта кніжка была сапраўдны першай і вельмі карыснай для маленькіх чытачоў.

Такім чынам, сёння гэтыя падручнікі Цёткі, адрасаваныя дзецям, даюць падставу для разгляду іх як своеасаблівай нацыянальна-асветніцкай праграмы пісьменніцы.

У 1914 годзе Цётка бярэцца за выданне часопіса для моладзі – “Лучынка”. Гэта быў літаратурны штомесячнік на беларускай мове, які па архіўных дакументах (ЦДГА г. Санкт-Пецярбурга, фонд № 776, вопіс 22, справа 219) працаваў па наступнай прагараме.

1. Аповесці, апавяданні, вершы, байкі.
2. Навукова - папулярныя артыкулы..
3. Артыкулы аб маралі.
4. Пагаворкі, загадкі, жарты, шарады і задачы.
5. Паштовая скрынка.
6. Аб’явы.

З гэтага дакумента відавочна, што афіцыйным рэдактарам часопіса быў А. Уласаў, аднак фактычным рэдактарам “Лучынкі” з’яўлялася Цётка.

Працуючы над выданнем “Лучынкі”, Цётка часта была незадаволена тым, што часопіс не мае свайго аблічча. Пра гэта яна пісала ў лісце да прафесара Б. Эпімаха - Шыпілы: “Лучынку запалілі, але покі што вельмі слаба яна тлее. Трэба больш агню ад маладых сіл. Дровы, з каторых цяпер шчапаецца “Лучынка”, залішне слязьмі – доляй нацягнула, дык слаба гарыць. Першы нумар выйшаў без аблічча ад незалежных ад нас прычын. Ратаваліся толькі, каб хаця як літаратурная кніжачка вышла не вельмі ліхая … Дзядзечка, клікніце кліч між беларускай маладзёжы, хай бярэцца да працы для пакіненых братоў і сёстраў у вёсцы…” [2, с.216-217].

Падкрэсліваючы, што “Лучынка” выйшла без аблічча “па незалежных ад нас прычынах”, пісьменніца мела на ўвазе царскую цэнзуру.

У сваіх артыкулах, якія Цётка змяшчала ў гэтым часопісе, вектар яе ідэйных пошукаў заўсёды быў скіраваны ў асветніцкую , маральную і педагагічнкю плоскасць. Для прыкладу можна назваць такія артыкулы як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Да вясковай моладзі беларускай”, “Шануйце роднае слова!”, “Аб душы маладзёжы”, “Да дзяўчатак”, “Да школьнай моладзі”. Пісьменніца заўсёды падкрэслівала, што на моладзі ляжыць вялікая адказнасць развіваць сваю родную мову, узбагачаць свой народ знаннем і культурай. Адсюль і запавет Цёткі развіваць у сабе любоў да чалавека, да народа, да радзімы.

У перыяд сваёй працы ў “Лучынцы” Цёйка часта звярталася да жанра нарыса. У гэтым жанры напісаны яе “Успаміны з паездкі ў Фінляндыю”, “З дарогі”, “Гутаркі аб птушках”.

Нарысы пісьменніцы – не проста пералік вядомых фактаў, а ўзор асветніцка - педагагічных даследаванняў першай чвэрці XX стагоддзя.

Праца Цёткі ў часопісе, яе публікацыі на старонках гэтага выдання не толькі садзейнічалі развіццю пазнавальных і эстэтычных здольнасцей падрастаючага пакалення, але і выконвалі нацыянальна-выхаваўчую фукцыю, спрыялі фарміраванню свядомасці беларускай моладзі,вучылі любіць сваю Радзіму і культуру.

Цётка стала пачынальніцай беларускай асветніцкай справы. Яна не толькі стварыла першыя беларускія падручнікі для дзяцей, але і заклала асновы асветніцкай беларускай методыкі. Творчасць пісьменніцы ўзбагаціла філалагічную навуку і педагогіку ідэямі нацыянальнай асветы і распрацоўкай методыкі навучання ў нацыянальнай школе.

**Літаратура**


1. Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць /В.А. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 336с.
2. Цётка. Выбраныя творы: Укл. В. Коўтун./Цётка – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 336с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ